1Н// 304115
(038)

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

***Н.У. Чайка***

# ТЫПАЛОГІЯ ЭЛІПСІСА Ў СІНТАКСІЧНАЙ СІСТЭМЕ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

*Манаграфія*

Мінск
2012

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Нацыянальная бібліятэка Беларусі

# ЗМЕСТ

**Дадатак А. Кампаненты семантычнай структуры канструкцый з эліпсісам дзеяслова ... 3**

**Дадатак Б. Прадуктыўнасць мадэлей канструкцый з эліпсісам дзеяслова ... 9**

Б.1. Дынамічна-лакатыўны тып ... 10

Б.2. Экзістэнцыяльна-лакатыўны тып ... 22

Б.3. Акцыянальныя тыпы ... 26

Б.4. Лакатыўна-пацыентыўны тып ... 37

Б.5. Акцыянальна-дэлібератыўны тып ... 41

Б.6. Статальны тып ... 45

Б.7. Экзістэнцыяльна-тэмпаральны тып ... 47

Б.8. Рэляцыйны тып ... 49

**Дадатак В. Частотнасць структурных тыпаў канструкцый з эліпсісам дзеяслова ... 51**

В.1. Поліпрэдыкатыўны тып ... 52

В.2. Звышфразавы тып: самастойныя сінтаксічныя адзінкі ў структуры звышфразавага адзінства ... 63

В.3. Звышфразавы тып: эліптычныя і парцэляваныя канструкцыі ў структуры звышфразавага адзінства ... 76

В.4. Ускладнена-паратаксічны тып ... 84

В.5. Ускладнена-паўпрэдыкатыўны тып ... 89

*В.5.1. Эліптычныя канструкцыі з адасобленымі азначэннямі ... 89*

*В.5.2. Эліптычныя канструкцыі з адасобленымі акалічнасцямі ... 91*

В.6. Ускладнена-параўнальны тып ... 94

В.7. Ускладнена-далучальны тып ... 96

В.8. Ускладнена-паратаксічны тып ... 98

*В.8.1. Ускладнена-інтрадуктыўны тып (з устаўнымі канструкцыямі) ... 98*

*В.8.2. Ускладнена-інтрадуктыўны тып (са звароткамі) ... 101*

**Дадатак Г. Кампенсаторныя семантычныя кампаненты ў канструкцыях з эліпсісам дзеяслова ... 103**

Г.1. Дынамічна-лакатыўны тып ... 104

Г.2. Акцыянальныя тыпы ... 110

Г.3. Лакатыўна-пацыентыўны тып ... 120

Г.4. Акцыянальна-дэлібератыўны тып ... 122

Г.5. Экзістэнцыяльна-лакатыўны тып ... 125

Г.6. Статальны тып ... 128

Г.7. Экзістэнцыянальна-тэмпаральны тып ... 130

Г.8. Рэляцыйны тып ... 132

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Дадатак Д. Функцыянаванне канструкцый з эліпсісам дзеяслова ........... 134**
Д.1. Выражэнне прэдыкатыўных катэгорый у канструкцыях з эліпсісам дзеяслова ........................................................................................................ 135
*Д.1.1. Выражэнне катэгорыі тэмпаральнасці ............................................. 135*
*Д.1.2. Выражэнне катэгорыі мадальнасці .................................................. 142*
*Д.1.3. Выражэнне катэгорыі персанальнасці ............................................. 149*
Д.2. Канструкцыйная поліфункцыянальнасць сінтаксем у парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый.............................................................. 155
*Д.2.1. Канструкцыйна-трансфармацыйныя фактары поліфункцыянальнасці сінтаксем ........................................................................................................ 155*
*Д.2.2. Канструкцыйна-катэгарыяльныя фактары поліфункцыянальнасці сінтаксем ........................................................................................................ 166*
*Д.2.3. Логіка-семантычныя фактары поліфункцыянальнасці сінтаксем .. 174*
**Дадатак Е. Акт аб укараненні.....................................................................177**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## *В.2. ЗВЫШФРАЗАВЫ ТЫП: САМАСТОЙНЫЯ СІНТАКСІЧНЫЯ АДЗІНКІ Ў СТРУКТУРЫ ЗВЫШФРАЗАВАГА АДЗІНСТВА*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| Кампаненты ў структуры звышфразавага адзінства | Адносіны паміж сінтаксічнымі адзінкамі (эліптычнай і поўнай) у структуры звышфразавага адзінства | Спосабы і сродкі рэалізацыі адносін | Агульная колькасць | Працэнтныя суадносіны | Прыклады |
|---|---|---|---|---|---|
| Эліптычная і поўная (або эліптычная) канструкцыі | **Логіка-семантычныя адносіны.** ***Тоеснасці*** | Паўтор лексічна тоесных прэдыкатыўнага (эліпсаванага) і паўпрэдыкатыўнага кампанентаў | 42 | 22 % | *Жылі і жывём усім, // Чым жыццё нас адорвае, // Свой крыж* ***несучы****, быццам лёс. // Хто – ўпарта! Над зорнаю прорваю. // Хто – роспачна – сцежкамі слёз* (Т. Бондар) |
| | | Метафарычны паўтор аб'ектных кампанентаў | 32 | 17 % | *Цяпер жа, кажуць,* ***пустых кабінетаў*** *многа. Самы момант якую-небудзь* ***свабодную пасаду*** (А. Макаёнак);<br>*Яшчэ* ***дыміцца ноч,*** *як галавешка. //* ***Туман*** *– //* ***Астылым попелам над ёй*** (А. Грачанікаў) |
| | | Анафарычны паўтор аб'ектных кампанентаў | 39 | 21 % | *–* ***Некалькі камісій*** *за тыдзень. І* ***кожнай*** *– увагу, транспарт...* (А. Дзялендзік) |
| | | Паўтор лексемы (прэдыкатыўна дамінантнай) у поўнай і эліптычнай канструкцыях | 33 | 18 % | *– Томачка, як заўсёды, са свежымі* ***кветкамі****.* (<u>Нюхае</u>). *Ах, як яны цудоўна пахнуць! Ды гэта ж палявыя...* (А. Макаёнак);<br>*А мне* ***патрэбны*** *сёння толькі кветкі. Заместа неба – кірмашовы дах. // Прылаўкі, што цяжкія ваганеткі. // І ў кожнага – свой* |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Працяг табліцы*

| Кампаненты ў структуры звышфразавага адзінства | Адносіны паміж сінтаксічнымі адзінкамі (эліптычнай і поўнай) у структуры звышфразавага адзінства | Спосабы і сродкі рэалізацыі адносін | Агульная колькасць | Працэнтныя суадносіны | Прыклады |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | *асаблівы пах...* (Р. Баравікова);<br>Каралёў *(дастае з партманета некалькі зялёных **банкнотаў**, кладзе іх на бакал). – Тут **трыста*** (А. Дудараў) |
| | | Паўтор функцыянальна эквівалентных кампанентаў | 41 | 22 % | *І вось (Ліда) дачку яму нарадзіла. **Адзіная ў іхняй палаце дзяўчынка. Ва ўсіх астатніх, як у яе, Нюты, хлопчыкі*** (Г. Багданава);<br>*– Ты як – **па вуліцы**? – глухім, перацятым голасам запытаўся ён. – Не, **цераз роў**. А там у поле і – на станцыю* (В. Быкаў) |
| *Усяго* | | | *187* | *100 %* | |
| Эліптычная і поўная (або эліптычная) канструкцыі | ***Супрацьпастаўленне*** | Супрацьпастаўленне кампанентаў без змены класа слоў (суб'ект – аб'ект) | 28 | 21 % | ***Вайна – вайной**... А трэба ўсім // Штодзень **акраец хлеба**...// Хай будзе ён сухім, малым, // Калючым, шэранькім, а з ім, // Надзённым, жытнім, дарагім, – // Нам жыць! **Акрайчык – трэба*** (А. Бялевіч);<br>*– Давайце я **схаджу**, – сказаў ён проста, нібы гутарка ішла аб якой драбязе. – Калі **што – кулямётам*** (В. Быкаў) |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Працяг табліцы*

| **Кампаненты ў структуры звышфразавага адзінства** | **Адносіны паміж сінтаксічнымі адзінкамі (эліптычнай і поўнай) у структуры звышфразавага адзінства** | **Спосабы і сродкі рэалізацыі адносін** | **Агульная колькасць** | **Працэнтныя суадносіны** | **Прыклады** |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Супрацьпастаўленне кампанентаў без змены класа слоў (аб'ект – аб'ект) | 32 | 24 % | –У падвале холадна. Ежы **няма**. А тут – ***сыр, малако, рыба, бананы*** (Г. Марчук); –*Чалавек зваліў работу. Яго б **з партыі**... А мы – **вымову**...* (А. Дзялендзік) |
| | | Супрацьпастаўленне кампанентаў са зменай класа слоў (аб'ект – аб'ект) | 47 | 34 % | – *Бывала ж, **хваробы** такой не было. А цяпер – **то адзін**, **то другі**, і ўсё больш з начальства* (А. Петрашкевіч) |
| | | Супрацьпастаўленне кампанентаў без змены класа слоў (іменны прэдыкат – аб'ект) | 29 | 21 % | – *А тут – **улась**, не крані яго. А сам – **за змеявік** ды пад ногі... Таптаць...* (І. Мележ) |
| *Усяго* | | | *136* | *100 %* | |
| Эліптычная і поўная (або эліптычная) канструкцыі | ***Адносіны неадпаведнасці.*** Адносіны частковай неадпаведнасці | Неадпаведнасць прэдыкатыўнага і тэмпаральнага кампанентаў | 12 | 14 % | – *Нічога, **уважу**! Не канешне – **на** вашага п'янага **Мікалая*** (І. Мележ) |
| | Адносіны поўнай неадпаведнасці | Неадпаведнасць прэдыкатыўнага і акалічнаснага кампанента | 39 | 44 % | – *Тут і ў сям'і **грызешся** вечна, брат брата за горла бярэ! А то каб з чужымі – **мірна**! Смех, дый годзе* (І. Мележ) |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Працяг табліцы*

| **Кампаненты ў структуры звышфразавага адзінства** | **Адносіны паміж сінтаксічнымі адзінкамі (эліптычнай і поўнай) у структуры звышфразавага адзінства** | **Спосабы і сродкі рэалізацыі адносін** | **Агульная колькасць** | **Працэнтныя суадносіны** | **Прыклады** |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Неадпаведнасць аб'ектных кампанентаў | 37 | 42 % | – *Зручная ў цябе пазіцыя –* ***за людзей***, ***для*** *іх* ***дабрабыту****. А тэхнакрат Ляшчук –* ***за бяздушныя агрэгаты****...* (А. Дзялендзік) |
| *Усяго* | | | *88* | *100 %* | |
| **Усяго (ад агульнай колькасці)** | | | **88** | **15 %** | |
| Поўная і эліптычная (або эліптычная) канструкцыі | ***Адносіны функцыянальнай эквівалентнасці***. Адносіны эквівалентнага ўключэння | Эквівалентнае уключэнне прэдыкатыўных і аб'ектна-суб'ектных кампанентаў | 47 | 29 % | ***– Я пра што…*** *Ці, скажам, табе не хацелася б мець у сталіцы трохпакаёвую кааператыўную?* (Г. Марчук);<br>*– Чуеш?...* ***Зноўку гром…*** *// А гэта, бацька, твой бушуе – // Цёплы, светлы дом* (А. Вялюгін);<br>*Аднойчы разважалі, // Колькі* ***хто хацеў бы*** *//* ***Жыць*** *на свеце. //* ***Матылі*** *– пакуль цвітуць кветкі. //* ***Птушкі*** *– пакуль іх носяць крылы. //* ***Звяры*** *– пакуль іх кормяць ногі. //* ***Дрэвы*** *– пакуль на сваіх плячах трымаюць неба* (М. Танк) |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Працяг табліцы*

| Кампаненты ў структуры звышфразавага адзінства | Адносіны паміж сінтаксічнымі адзінкамі (эліптычнай і поўнай) у структуры звышфразавага адзінства | Спосабы і сродкі рэалізацыі адносін | Агульная колькасць | Працэнтныя суадносіны | Прыклады |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Эквівалентнае ўключэнне зместу дзеяслоўнага прэдыката (эліпсаванага) у іменны | 25 | 15 % | *А трэція – дык **занятыя**! Адразу па два **кавалеры, як стража**, па баках* (І. Мележ); ***Ну вось і ўсё**… Куды цяпер?* (Г. Багданава) |
| | | Эквівалентнае ўключэнне зместу аб'ектнага кампанента ў суб'ектны | 18 | 11 % | *– Тут – **заключэнне праектнага інстытута**! Гэта – з міністэрства! Гэта – **доктар навук са сталіцы**!* (А. Дзялендзік); ***Яны** ж **рэліквіі** Кіеўскай Русі 10 – 12 стагоддзя. Ад **іх** – назва вёскі* (А. Петрашкевіч) |
| | Адносіны безэквівалентнага ўключэння | Безэквівалентнае ўключэнне зместу эліптычнай канструкцыі ў змест поўнай | 19 | 12 % | *Чамусьці ўзяў і ўсё парушыў. **На мой прывет – глухі адказ*** (Р. Баравікова); ***Хопіць вам пра грошы**. Сядайце да стала* (Г. Марчук); *– Цяпер лепш. Спачатку дай таблеткі. **Я магу і халоднае*** (А. Дзялендзік); *– **Я не пра тое…** Каб адрамантаваць водаправодную сетку, патрэбна не менш трох сутак* (М. Матукоўскі); |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Працяг табліцы*

| **Кампаненты ў структуры звышфразавага адзінства** | **Адносіны паміж сінтаксічнымі адзінкамі (эліптычнай і поўнай) у структуры звышфразавага адзінства** | **Спосабы і сродкі рэалізацыі адносін** | **Агульная колькасць** | **Працэнтныя суадносіны** | **Прыклады** |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | – ***Гэта я ад радасці****… Клянуся, я не верыла, што можна знайсці такія грошы. І Юля не верыла. Толькі ты верыў* (А. Дудараў);<br>– ***Гэта ў вас ад бяссонніцы****… У чатыры раніцы толькі пеўні сур'ёзна кукарэкаюць* (А. Дудараў) |
| | Уключэнне кампанентаў, што знаходзяцца ў рода-відавых адносінах | Рода-відавае ўключэнне аб'ектных кампанентаў | 27 | 17 % | – *Ето –* ***камісія****: адны* ***калгасаўскія****!.. Аднаго* ***Чарнушку*** *– ад усяго сяла* (І. Мележ);<br>– *Наслухаўся я да моташнасці і мусульманскіх* ***паслоў****, і копскіх, і іудзейскіх… А цяпер вось яшчэ і* ***грэчаскі*** *на нашу галаву* (А. Петрашкевіч) |
| | Уключэнне функцыянальна тоесных кампанентаў | Уключэнне зместу акалічнаснага кампанента ў змест прэдыкатыўнага (функцыянальна тоеснага) | 26 | 16 % | ***Бягу****. Чаго стаяць пад грушай. І* ***наўздагонку*** *– лістапад* (Р. Баравікова);<br>*Музыку і там* ***любяць****.* ***Я ахвотна*** (К. Чорны);<br>***Свячка, значыцца, з табой****. // А ўсё ж* ***пакаж*** *паперу* (А. Бялевіч) |
| *Усяго* | | | *162* | *100 %* | |
| **Усяго (ад агульнай колькасці)** | | | **162** | **27,5 %** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Працяг табліцы*

| Кампаненты ў структуры звышфразавага адзінства | Адносіны паміж сінтаксічнымі адзінкамі (эліптычнай і поўнай) у структуры звышфразавага адзінства | Спосабы і сродкі рэалізацыі адносін | Агульная колькасць | Працэнтныя суадносіны | Прыклады |
|---|---|---|---|---|---|
| Поўная і эліптычная канструкцыі | ***Адносіны перакрыжавання*** | Перакрыжаванне прэдыкатыўных і аб'ектных кампанентаў, што адносяцца да розных мностваў | 14 | 2,5 % | *Ён усміхнуўся і мімаходзь заўважыў: як **жанчына** ставіцца да кветак, так і да мужа. Зноў ён пра сваю **жонку**...* (Г. Багданава); *Таленавітым людзям нельга жыць па адным. Памятаю, калі вучыліся, быў **фільм** «Монпарнас-19». **Там** таксама пра гэта* (Г. Багданава); *Гэта ж мне казалі: у ЦК камсамола вызвалілася **месца інструктара**. Прасілі падказаць **каго*** (Г. Багданава); *Тут завезлі адну **рэч** у магазін. Хачу цешчы **ў падарунак*** (Г. Марчук); *– Шар зямны да вачэй **абклееныя**. // У **навінах** – дошка аб'яў. // **Словы, словы** – нібы з канвеера... // А навокал – вецер гуляў...* (В. Зуёнак); *От бо **памяць** у мяне! Каб яна спрахла. **Дзе ж гэта я**?..* (К. Чорны); |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Працяг табліцы*

| Кампаненты ў структуры звышфразавага адзінства | Адносіны паміж сінтаксічнымі адзінкамі (эліптычнай і поўнай) у структуры звышфразавага адзінства | Спосабы і сродкі рэалізацыі адносін | Агульная колькасць | Працэнтныя суадносіны | Прыклады |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | *Каб мне ды свайго* ***агранома****… Прызнацца, я б,* ***можа****,* ***не ламаў галавы*** *над гэтымі кніжкамі* (А. Макаёнак); *Мільгаюць падковамі коні. //* ***Я – з вамі*** (Л. Геніюш); *Прыкідваўся галодным, бедным. У золата дачку апранае.* ***Вазу за васемсот рублёў*** (Г. Марчук) |
| *Усяго (лагічныя адносіны)* | | | *587* | *100 %* | |
| **Усяго (ад агульнай колькасці)** | | | **587** | **56,8 %** | |
| Поўная і эліптычная канструкцыі | ***Семантыка-сінтаксічныя адносіны.*** Эліптычны сказ змяшчае вывад | Сэнсавае ўзаемадзеянне | 63 | 14 % | Мухіна (разгублена). *На распрацоўку гэтай ідэі мы загубілі столькі часу і сродкаў...* ***І, ведаеце, не трэба так заўзята****...* (А. Петрашкевіч); *Уцёк я, Марыя Вікенцьеўна.* ***Старастам цяпер у вашага бацюшкі*** (Г. Марчук); *Мы выйшлі з кавярні.* ***І зноў проста ў вочы – гэты мажны пыхлівы дом з калонамі па той бок праспекта*** (Г. Багданава) |

*Працяг табліцы*

| **Кампаненты ў структуры звышфразавага адзінства** | **Адносіны паміж сінтаксічнымі адзінкамі (эліптычнай і поўнай) у структуры звышфразавага адзінства** | **Спосабы і сродкі рэалізацыі адносін** | **Агульная колькасць** | **Працэнтныя суадносіны** | **Прыклады** |
|---|---|---|---|---|---|
| | Эліптычны сказ змяшчае пасылку | Сэнсавае ўзаемадзеянне | 24 | 5 % | – ***Каб я – і з ёй***? *// Ды ты вар'ятка, // Калі паверыла ў абман* (Н. Гілевіч); ***Дзіця… А як тады з навукай?*** *// Яно, павер, мне звяжа рукі, // І я тады ўжо не вучоны* (А. Бачыла) |
| | Адносіны выніковасці (эліптычны сказ змяшчае пасылку) | Сэнсавае ўзаемадзеянне | 28 | 6 % | – *Альжбета Францаўна Кудзёлка... // Разводка быццам бы..., але // Па ўсім відаць, што не свісцёлка... //* ***Да ўсіх – з павагай у сяле***... (Н. Гілевіч) |
| Эліптычныя канструкцыі | Умоўна-выніковыя адносіны | Сэнсавае ўзаемадзеянне | 52 | 12 % | – ***І каб нікому ні слова***! *Паняла?* ***А то – пеўніка пад стрэшку*** (В. Быкаў) |
| Поўная і эліптычная канструкцыі | Прычынныя адносіны (эліптычны сказ змяшчае прычыну) | Сэнсавае ўзаемадзеянне | 29 | 6 % | – *Прысядкі ёй трэба! З маім здароўем – «Лявоніху». Хадзі во, разгінай мяне...* ***У мяне ж сярэдзіна*** (А. Дудараў); *А вы не маглі б ваш тон на дзве актавы ніжэй? ...* ***Ці так перапалохаліся за сваю дысертацыю?*** (А. Петрашкевіч) |
| | Прычынныя адносіны (парцэляваны поўны | Структурна-сэнсавае ўзаемадзеянне з пар- | 34 | 8 % | ***Каб дзень ад воч цямрэчай неадрыўнай***, *//* ***Каб не ўсчалася, не прыйшла вайна***... *//* |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Працяг табліцы*

| Кампаненты ў структуры звышфразавага адзінства | Адносіны паміж сінтаксічнымі адзінкамі (эліптычнай і поўнай) у структуры звышфразавага адзінства | Спосабы і сродкі рэалізацыі адносін | Агульная колькасць | Працэнтныя суадносіны | Прыклады |
|---|---|---|---|---|---|
| | сказ змяшчае прычыну) | цэляванай канструкцыяй | | | *Мне Мацераю Божаю яна* (Т. Бондар) |
| Эліптычныя канструкцыі | Прычынныя адносіны (адзін з эліптычных сказаў змяшчае прычыну) | Сэнсавае ўзаемадзеянне | 38 | 9 % | *– А табе – абы ў рожкі.* ***Не можаш з зяцем па-добраму*** (А. Петрашкевіч)*;* ***Яны ўжо тут.*** *У дзверы не выйдзем. Ты зможаш праз акно?* (М. Матукоўскі) |
| Поўная і эліптычная канструкцыі | Адносіны меры і ступені (эліптычны сказ указвае на меру і ступень) | Сэнсавае ўзаемадзеянне | 19 | 4 % | *Мясціна слаўная на зайздрасць. //* ***Сюды – не сорам*** *– з* ***«кірмашу»****... // Ну што ж, вярнуся ў хату зараз, // Скажу таксама Тамашу...* (Н. Гілевіч) |
| Поўная і эліптычная канструкцыі | Мэтавыя адносіны (поўны сказ змяшчае мэту) | Структурна-сэнсавае ўзаемадзеянне з парцэляванай канструкцыяй | 32 | 7 % | *Туды, туды – увага, сіла, // І грошы, сродкі ўсе – туды. //* ***Каб цаліна закаласіла*** *//* ***На незлічоныя пуды*** (Н. Гілевіч) |
| Эліптычныя канструкцыі | Прычынныя адносіны (парцэляваны эліптычны сказ змяшчае прычыну) | Структурна-сэнсавае ўзаемадзеянне з парцэляванай канструкцыяй | 67 | 15 % | *– Мне галоўнае – каб у партызаны.* ***Бо мне ўжо дома – неяк*** (В. Быкаў); *Ідзі зрубі дзве грушы.* ***Месца пад новую цяпліцу трэба*** (Г. Марчук) |

РЭПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Працяг табліцы*

| **Кампаненты ў структуры звышфразавага адзінства** | **Адносіны паміж сінтаксічнымі адзінкамі (эліптычнай і поўнай) у структуры звышфразавага адзінства** | **Спосабы і сродкі рэалізацыі адносін** | **Агульная колькасць** | **Працэнтныя суадносіны** | **Прыклады** |
|---|---|---|---|---|---|
| Поўная і эліптычная канструкцыі | Эліптычны сказ змяшчае абагульненне | Сэнсавае ўзаемадзеянне | 21 | 5 % | – *Гаварыць табе яшчэ хочацца з кім-небудзь... А перад смерцю чалавек заціхае і маўчыць, як тваё Сонца...* ***Колькі гэта табе?*** (А. Дудараў);<br>*Зноў званок – настойлівы, вясёлы.* ***Гэта акцёры*** (Г. Багданава);<br>*Я заўсёды хацеў любіць, і мара ад мяне хілілася, як здрадніца... Калі спрабавалі любіць, дык абавязкова за нешта…*<br>***Ты ўжо дахаты?*** (А. Дудараў);<br>*Каварныя, зламысныя, адступніцкія часы, князь.* ***Не ты, дык цябе*** (А. Петрашкевіч);<br>*– Глядзі, Хрысця, загіне сын.* ***У такі момант – разам трэба*** (А. Дзялендзік);<br>*– Не! Пойдзем! – яна цягнула сына да сельсавета! – Я гэтаму … начальніку пакажу!* ***Гэта яму не пры немцах!*** *Ён у мяне паскача!* (А. Дудараў) |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Заканчэнне табліцы*

| **Кампаненты ў структуры звышфразавага адзінства** | **Адносіны паміж сінтаксічнымі адзінкамі (эліптычнай і поўнай) у структуры звышфразавага адзінства** | **Спосабы і сродкі рэалізацыі адносін** | **Агульная колькасць** | **Працэнтныя суадносіны** | **Прыклады** |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Сэнсавае ўзаемадзеянне метафарызаваных кампанентаў | 41 | 9 % | *Усё, чытач. Я стаўлю кропку. // Ах, не завершаны сюжэт? // Ну што ж рабіць?* ***Далей – ні кроку****. //* ***Далей – табу*** *і* ***запавед*** (Н. Гілевіч) |
| *Усяго (семантыка-сінтаксічныя адносіны)* | | | *448* | *100 %* | |
| ***Усяго (ад агульнай колькасці)*** | | | ***448*** | ***43,2 %*** | |
| **Усяго** | | | **1035** | **100 %** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ